***А.У. Говіч***
БДЭУ (Мінск)

# ПОГЛЯД НА ДЗЯРЖАЎНАЕ ЎЛАДКАВАННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў АНАНІМНЫМ ПАЛЕМІЧНЫМ ТРАКТАЦЕ «РАЗМОВА ПАЛЯКА З ЛІТВІНАМ»

Сярэдзіна XVI ст. ў Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) адзначаецца атывізацыяй сацыяльна-палітычнага жыцця, што садзейнічала таксама развіццю адпаведнай інтэлектуальнай рэфлексіі. У дадзены перыяд у грамадстве ўзнікае пытанне далейшага развіцця краіны: ці неабходна ВКЛ ўтвараць адзіную дзяржаву разам з Польскай Каронай. На фоне дадзенай грамадска-палітычнай праблематыкі з'яўляеца ананімны твор «Размова Паляка з Літвінам» у адказ на надрукаваны ў 1564 г. польскім палітычным і рэлігійным дзеячам Станіславам Ажахоўскім «Quincunx, to jest wzór Korony Polskiej na cynku wystawiony» (Квинкункс альбо погляд Кароны польскай на парадак уладкавання).

«Размова» ўяўляе сабой дыялог паляка, які прытрымліваецца пазіцый Ажахоўскага, і літвіна, які нясе ў сабе думкі аўтара. Па сённяшні дзень цяжкім застаецца пытанне аўтарства трактата. Нягледзячы на тое, што на творы стаялі ініцыялы А. В., з чаго можна зрабіць выснову, што аўтарам можа быць Андрэй Волан, але шэраг гісторыкаў не можа з упэўненнасцю гэта падцвердзіць, і ёсць некалькі падставаў, якія дазваляюць ім гэта рабіць [1, с. 24].

Важна адзначыць, што Волан быў кальвіністам і ўдзельнікам руху Рэфармацыі, ў той час як пазіцыя літвіна-аўтара вельмі часта схіляецца да моцнага даверу да каталіцкай царквы і падтрымкі Контррэфармацыі. Акрамя асобы аўтара, пытанні ўзнікаюць наконт года і месца друкавання твора. Улічваючы тое, што «Размова…» – гэта своеасаблівы адказ на «Quincunx», можна лічыць, што гэта прыкладна 1565 – 1566 гг.

Неабходна адзначыць тое, што дадзены перыяд у гісторыі ВКЛ звязаны з праблемай аб'яднання з Польшчай ва ўмовах вядзення Інфлянцкай (Лівонскай) вайны, якое было павінна прывесці не толькі да абмежавання суверэнітэту ВКЛ, але і да істотных трансфармацый яго грамадска-палітычнага ладу.

У сваёй працы С. Ажахоўскі супрацьпастаўляе каралеўства і княства як дзве радыкальна адрозныя формы дзяржаўнага ўладкавання. Сутнаснай характарыстыкай каралеўства вызначаецца свабода, а княства – няволя [1, с. 27]. Праведзены Ажахоўскім аналіз адрозненняў каралеўства і княства падводзіў да высновы пра тое, што адзіным шляхам пазбаўлення ад няволі для падданых ВКЛ з'яўляецца далучэнне да Польскага каралеўства. Важна адзначыць, што Ажахоўскі ў сваім творы выказваецца супраць аб'яднання Княства і Польшчы на роўных умовах з захаваннем суверэнітэту ВКЛ: «…нявольная Літва з вольнаю Польшчай ніякім чынам аб'яднаная быць не можа, да тых часоў, пакуль вялікі князь літоўскі, прыродны і спадчынны пан не зробіць яе вольнаю (...), абы такім чынам вызваленая з прыроднай сваёй няволі Літва магла б аб'яднацца з Польскай дзяржавай як вольная з вольнай» [1, с. 28].

Улічваючы тое, што шматлікая літвінскія магнаты і шляхта выступалі супраць уваходу ВКЛ у склад Польшчы на ўмовах, якія ставіла Карона, можна зрабіць выснову,

што «Размова паляка з літвінам» – гэта калектыўная праца некалькіх дзеячаў духоўнай і свецкай эліты ВКЛ, якія, нягледзячы на рознагалоссі ў рэлігійнай сферы, узгоднена выступалі на палітычнай арэне.

Аўтар «Размовы…» піша наступныя радкі: «Regnum і ducatis не супрацьлеглыя рэчы, паколькі не кожнае каралеўства з'яўляецца свабодным (...), і не кожнае княства выступае нявольным», з гатага можна зрабіць высновы таго, што і каралеўства, і княства – гэта два бакі аднаго і таго ж медаля – манархіі, якую і лічыць найлепшай формай дзяржаўнага праўлення [2, с. 58-59].

Галоўнай ідэяй дзяржаўнага ўладкавання з'яўляеца стварэнне вольнай дзяржавы, у якой, як лічыць аўтар, «сапраўдная свабода там, дзе людзі (...) ўсе свае думкі, справы і імкненні скіроўваюць да агульнага дабра, бо яно лепшае, чым уласнае» [2, с. 37]. У адрозненне ад «Quincunx», дзе ўлада манарха абмежавана правамі шляхты, аўтар «Размовы…» лічыць, што абмежаванне ўлады караля вядзе да да поўнай безадказнасці і паралічу ўлады, што было падцверджана праз два стагоддзі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, у якой улада манарха была вельмі моцна абмежавана Соймам.

Вельмі важным адрозненнем ад ідэй Ажахоўскага з'яўляецца погляд аўтара на выбар формы манархіі і самога манарха: першы лічыў, што выбарнасць манарха з'яўляецца прыкметай «вольнай дзяржавы», для другога найлепшай формай дзяржаўнага кіравання з'яўлялася спадчынная манархія. Аўтар прыводзіць у доказ дадзенага сцвярджэння наступнае: «кожны чалавек натуральна больш прыхільна ставіцца да свайго, а не да чужога, а таму, з аднаго боку, манарх-ураджэнец сваёй краіны заўсёды будзе больш пільна дбаць пра інтарэсы дзяржавы, чым чужаземец, з другога, падданыя будуць больш старанна падпарадкоўвацца кіраўніку дзяржавы, які з'яўляецца іх земляком, чым іншаземцу» [1, с. 32].

У «Размове Паляка з Літвінам» падкрэсліваецца вялікая роля ў дзяржаве рады: «няхай кіруе кароль, а каралём не кіруе ніхто, толькі Бог і права, а каб ведаў, што кажа Бог і чаму вучыць права, яму дадзеныя паводле старажытнай і добрай пастановы дзве рады – духоўная і свецкая, якія называюцца сенатам» [2, с. 50]. Дадзеныя органы павінны былі дапамагаць манарху ў кіраванні дзяржавай на аснове ўсталяваных прававых нормаў.

Аўтар «Размовы…» падымае пытанне тыраніі і шляхецкай дэмакратыі. Што тычыцца тыраніі, то ў той час у Еўропе было вельмі распаўсюджана права народа на супраціў тыраніі. Галоўны сэнс яе дачынення да «Размовы Паляка з Літвінам» палягае ў тым, што манарх абавязаны прытрымлівацца ўстаноўленага ў дзяржаве права і ўлічваць інтарэсы палітычнай эліты. Вось так аб гэтым піша аўтар: «Такога б [тырана] Літва не цярпела б, нават, калі той меў паходжанне з яе крыві. Старалася б знайсці іншага, лепш нават чужаземца» [2, с. 66]. Таксама і шляхецкая дэмакратыя атрымлівае негатыўную ацэнку ад аўтара, таму што ўяўляе сабой анархію, якая вядзе да крызісу ўлады і пазбаўляе грамадзян бяспекі і абароны з боку дзяржавы. Важным адрозненнем шляхты ВКЛ і Польшчы з'яўляецца тое, што ў Кароне: «… хто ўзвысіцца з дапамогай або гаспадаркі, або шлюбу, спадчыны, паводзінамі, красамоўствам, парушэннем правоў, той пан!» [2, с. 48]. Аўтар крытыкуе непажаданую палітычную эмансіпацыю шляхты ВКЛ і лічыць гэта непажаданым вынікам уплыву Польшчы.

Такім чынам, у «Размове Паляка з Літвінам» у якасці найлепшага тыпу дзяржаўнага ўладкавання прадстаўляецца спадчынная манархія, абмежаваная духоўнай і

свецкай арыстакратыяй, якую прадстаўляе спецыяльны орган дзяржаўнага кіравання – Рада. Аўтар адмоўна ставіцца да рэфармавання дзяржавы ў бок шляхецкай дэмакратыі, што гаворыць аб кансерватызме і традыцыяналізме разглядаемага твора. Увогуле ідэі, выказаныя ў «Размове…», адлюстроўваюць інтарэсы магнатаў ВКЛ.

Тэарэтычныя разважанні праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў «Размове Паляка з Літвінам» былі ўключаны ў кантэкст дыскусіі вакол уніі ВКЛ з Польскім Каралеўствам. Захаванне дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ непарушным служыла абгрунтаваннем ідэі дзяржаўнага суверэнітэту: «Хочам карыстацца свабодай, у якой з ласкі Божай даўно знаходзімся, але сваю, здаўна ўсталяваную і добра ўладкаваную дзяржаву, далучыўшы да вашай, страціць не хочам (…)» [2, с. 1]. У гэтай сувязі ўнія бачылася магчымай толькі на раўнапраўнай аснове, пры захаванні адметнай дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ.

Такім чынам, прааналізаваўшы «Размову Паляка з Літвінам», зробім некалькі высноваў:

1. Аўтар дадзенага твора і па сённяшні дзень застаецца невядомым, нягледзячы на тое, што на самім творы стаялі ініцыялы А. В., што дае падставы лічыць, што гэта Андрэй Волан; самі ідэі, якія ў ім адлюстроўваюцца, супярэчаць ідэям Волана. Напрыклад: у «Размове…» ёсць падтрымка каталіцызму, у той самы час, як Волан з’яўляўся адным з найбольш паслядоўных прадстаўнікоў кальвінізму. Таму існуе гіпотэза, што «Размова Паляка з Літвінам» – калектыўная праца некалькіх чалавек. Таму на дадзенае пытанне мы ячшэ павінны атрымаць адказ, таму што яно нікім не асвятлівалася.

2. «Размова Паляка з Літванам» увасабляе ў сабе не толькі адказ на «Quincunx» С. Ажахоўскага, але і думкі тагачасных магнатаў ВКЛ наконт уніі з Польшчай. Такім чынам, вышэйшыя асобы Княства не жадалі ўключэння ў склад іншай дзяржавы не на роўных правах, каб не згубіць свой суверэнітэт. Але, як мы ведаем, 1 ліпеня 1569 г. ў Любліне будзе падпісана ўнія аб утварэнні Рэчы Паспалітай, у якой ВКЛ мела значна менш паўнамоцтваў, чым Польшча. А потым, праз 200 гадоў, славутая «шляхецкая дэмакратыя», якая крытыкавалася Літвінам-аўтарам, прывядзе да знішчэння краіны і падзелаў яе паміж суседнімі дзяржавамі канчаткова ў 1795 г.

Спіс літаратуры

1. Бортнік, І. Праблема дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў ананімнай працы «Размова Паляка з Літвінам» / І. Бортнік // Гістарычны альманах : навуковы гістарычны і краязнаўчы часопіс. – 2010. –Том 16. – С. 24 – 36.

2. Rozmowa Polaka z Litwinem. 1564 / Wyd. J. Korzeniowski. – Kraków, w Drukarni Universytetu Jagellonskiego, 1890. – VIII, 91 c.